**Маркевіч, М.** Захоўвае і слова пісьмовае / М.  Маркевіч/ / Аршанская газета. — 2002. — 24 снеж. — С. 4.

## ЗАХОЎВАЕ І СЛОВА ПІСЬМОВАЕ

*Афганістан стаў нашым агульным болем. У ім пабывалі каля 30 тысяч беларусаў, 771 з іх загінуў. Аднак пра ўсіх Беларусь ведае – у 1991 годзе ў выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя» выйшла кніга «Памяць. Афганістан».*

*Даследчыцкая работа пра іх лёсы і маладыя жыцці працягваецца і цяпер. Нядаўна на другіх гарадскіх оршазнаўчых чытаннях школьнікаў «Імі ганарыцца наша школа» такое даследаванне прадстаўляў вучань Іван Барковіч з СШ № 25 пад кіраўніцтвам настаўніцы Т. Сталяровай. Яно так і называецца «Жывём і помнім», пра воіна-афганца Алега Панькова, па ўспамінах тых, хто добра ведаў яго два дзесяткі год назад.*

Алег Панькоў нарадзіўся ў пасёлку Балбасава ў маі 1963 года, скончыў яго сярэднюю школу, а ў 1981-м – ПТВ-98 хімікаў у Магілёве, кароткі час працаваў слесарам-мантажнікам у Віцебску. Адсюль у гэтым жа годзе быў прызваны ў армію. Служыў у Каўнасе і Полацку ў дэсантных войсках. З Полацка яго накіравалі ў Афганістан, дзе загінуў у жніўні 1982 года. Пахаваны ў гарпасёлку Балбасава. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Сёння дакладна вядома і тое, як загінуў гэты мужны воін-зямляк: «Гэта здарылася 17 жніўня 1982 года. У той дзень рота, у якой ён служыў, дзейнічала па «зачыстцы» населенага пункта. Наперадзе роты ішлі чатыры чалавекі. Сярод іх быў і Алег Панькоў.

Лясная паляна, праз якую прабіраліся салдаты, была вельмі густой. Як толькі нашы байцы выйшлі на адкрытае месца, па іх адкрылі агонь. Хутка заняўшы пазіцыі, яны размеркаваліся на ўзгорку і пачалі адстрэльвацца. Алег ляжаў наперадзе ўсіх, бачыў, як перасоўваюцца душманы. Трапным  агнём са свайго аўтамата ён даў магчымасць групе, якая ішла ззаду, заняць абарону. Гэтым Алег выратаваў жыцці дзесяткаў салдат.

У жорсткай перастрэлцы  Алег быў  смяротна паранены. Яго вынеслі з поля бою, зрабілі перавязку. Мужны салдат стрымліваў боль, жартаваў, усміхаўся. У верталёце, па дарозе ў шпіталь, ён памёр».

Тое, што Алег Панькоў быў добрым, разумным і мужным чалавекам, з якога маглі браць прыклад іншыя, пацвярджаюць і ўспаміны аб ім.

**Р. ВЯЦЕОРАЦ, першая настаўніца:**

– Лёгка давалася яму матэматыка, ён прыгожа і акуратна пісаў у сшытках. Сярод аднакласнікаў у  Алега было шмат сяброў. Ён  умеў сябраваць, быў сумленным, праўдзівым, любіў працаваць, добра маляваў,  ляпіў з пластыліну самалеты, танкі.  Марыў стаць танкістам. У класе Алега любілі, прыслухоўваліся да яго меркаванняў.

**М. ВОЛКАВА, класны кіраўнік:**

– Калі размова ішла аб маральнасці і чуласці, ён не саромеўся казаць аб душэўнасці і аб сваіх суперажываннях, а гэта пад сілу не кожнаму падлетку. Дзякуючы   Алегу   дыспуты, якія праводзіліся ў класе па рознай тэматыцы, насілі той адбітак шчырасці, якая магчымая, калі ёсць у

класе вучань, падобны на Алега. Ён быў вельмі сумленным. Я заўсёды поўнасцю яму давярала, не сумнявалася ў праўдзівасці яго слоў. З ім было лёгка і проста размаўляць. За любую справу ён браўся добраахвотна, прыцягваючы да яе сваіх таварышаў. Калі мне ў чымсьці было цяжка арганізаваць вучняў, я звярталася да Алега. За душэўную чуласць яго любілі настаўнікі і навучэнцы.

**В. ЗІНКЕВІЧ, аднакласнік:**

– Алега я ведаў усяго два гады, з таго моманту, як патрапіў у восьмы клас. Аднак гэтых гадоў хапіла, каб спазнаць яго характар і стаць яго таварышам. Гэта быў адзін з самых вясёлых і дружалюбных хлопцаў у нашым класе, ніводнага мерапрыемства не праводзілася без яго ўдзелу ў школе.

**Ёсць тут успаміны і маці Алега Панькова Ніны Іосіфаўны:**

«Апошні раз бачыла яго ў Каўнусе ў сакавіку 1981 года. Ён яшчэ больш змяніўся, узмужнеў, пасталеў. Мне запомніўся яго недзіцячы, мужны погляд». Памяць пра добрага чалавека жыве доўга. Добра, калі яна захоўваецца і такім чынам – пісьмовым словам са шматлікімі фотаздымкамі.

**М. Маркевіч**